Кніжны гасцінец

# У МІГЦЕННІ КАДРАЎ, СЛОЎ І ЯЛІНАК

**Лясная гісторыя. 25 апавяданняў пра прыроду. Мінск, «Мастацкая літаратура», 2021.**




Прыродная стыхія — найлепшы фон для самых лютых жарсцяў ды ілюстрацыя філасофскіх разважанняў, а часам і дзеючая асоба. Гэта даказвае чарговы тэматычны зборнік выдавецтва «Мастацкая літаратура». Хочаце паразважаць пра нацыянальны характар? У апавяданні народнага пісьменніка Янкі Брыля «Гуртавое» падчас пакосу людзі заўважаюць міграцыю драчоў, па-руску — «коростелей». Гэтая птушка перасоўваецца па зямлі, «нейкаю сутулай ды імклівай пехатой і смешным подлетам»... Штогод усе вяскоўцы — пастушкі, касцы, жанкі, старэчы — ідуць падзівіцца на птушак, бягуць наўздагон... І пры гэтым ніхто не забівае птахаў... Бягуць вяскоўцы, смеючыся, каб злавіць «лугавога скрыпача» ці хоць зірнуць зблізу, «ведаючы, што не надта зловіш, і не кідаючы нічым наўздагон, каб не забіць з блазненскага дуру», даганяюць «вясёлае раскрыццё лугавой таямніцы». Ці не праўда, дужа нагадвае «Апокрыф» Максіма Багдановіча, дзе жанчыны пяюць аб красе васількоў, пустазелля, якое замінае расці калоссям? Бо жыва душа ў народзе гэтым. Бо імкнуцца нават самыя простыя ўслед за нязлоўнай красой і таямніцай жыцця.

А вось лес у апавяданні Якуба Коласа «Малады дубок» — дэкарацыя для складаных псіхалагічных «разборак». Малады селянін Андрэй крадзе дубок з панскага лесу, з-за гэтага выганяюць са службы лесніка Максіма... А Андрэя, не раўнуючы як Радзівона Раскольнікава, апаноўваюць пакуты сумлення... Наколькі можна захаваць шчырае і чароўнае дзіцячае ўспрыманне свету праз гады? У апавяданні Васіля Макарэвіча «Яліна-ялінка» апавядальнік прыходзіць на сталічны Камароўскі рынак, каб набыць напрадодні навагоднюю ёлку, і адно з тых дрэўцаў здаецца яму дужа падобным да тае ялінкі, з якой ён сябраваў у дзяцінстве... Вясковы хлопчык называў Ялінку-былінку сястрой-сястрыцай, і вельмі пакрыўдзіўся за яе, калі сусед Юстын загубіў вогнішчам суседнюю вялікую яліну, якую хлопчык лічыў бабуляй сваёй сяброўкі... І вырасшы, не страціў герой гэты дар — адчуваць сваяцтва з прыродай...

**Л. П. Саянкова-Мельницкая. Белорусская кинокритика XX-XXI вв.: от первых анонсов в печати до гибридных жанров в интернете. Мінск, БДУ, 2020.**



Калі ў 1913 годзе на старонках часопіса «Маскі» разгарнулася дыскусія, што перамажа — кіно ці тэатр, як аргумент падкрэслівалі «галоўную асаблівасць» кіно — прымітыўнасць. Маўляў, *«калі кінематограф паказвае вам злодзея, дык гэта ўжо сапраўдны зладзюга, і вы пачынаеце ненавідзець яго з першага ж погляду за адзін яго капялюш»...*

З тых часоў у мастацтве кіно — якое з тэатральным цудоўна ўжываецца, а часам і сінтэзуецца — з'явілася шмат нюансаў і сэнсавых праслоек... Так што кінакрытыкам ёсць дзе даць волю інтэлекту, не менш, чым крытыкам літаратурным. Зрэшты, першыя пра кіно і пісалі зазвычай літаратары.

У сваёй чарговай манаграфіі вядомы кінакрытык і навуковец Людміла Саянкова аналізуе шмат фактаў з гісторыі беларускай кінакрытыкі. Гісторыя немаленькая, бо першыя кінаўстаноўкі з'явіліся ў Мінску яшчэ ў 1900 г., іх уладальнікам быў Рыхард Штрэмер, які фінансаваў здымкі дакументальных рэпартажаў пра пажары і крушэнні цягнікоў. А публікацыі пра кіно выглядалі прыблізна так: «Фильмы! Лучшие в мире! Поражающия! Бесподобныя! Ужасы. Слезы. Смех. Кровь».

У 1920-х у газеце «Звязда» з'яўляецца рубрыка «Кіно». Людміла Саянкова называе і імя першага беларускага кінакалумніста — Уладзімір Лілін. Калісьці ў «Звяздзе» ўхвальна адгукнуліся на першы беларускі гульнявы фільм «Лясная быль», зняты Юрыем Тарычам па аповесці Міхася Чарота «Грышка-свінапас». А згаданы Уладзімір Лілін у іншым выданні ўпікнуў рэжысёраў фільма, што мала «рэвалюцыйнай рамантыкі».

У кнізе шмат цікавых фактаў і метадычных рэкамендацый, напрыклад, падрабязна разглядаецца, чым адрозніваецца анонс ад анатацыі... Шмат цытат з сучаснай прэсы, якія адлюстроўваюць стан не толькі беларускага, але і сусветнага кінематографа, аналізуюцца асаблівасці сеткавай кінакрытыкі. Вядома, гэта найперш навуковае выданне, адрасаванае журналістам-пачаткоўцам, але і кожны аматар кіно знойдзе там мноства цікавай інфармацыі і падстаў для разважанняў.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

*Выданні для агляду прадстаўленыя кніжным крамай «Акадэмічная кніга», Мінск, пр-т Незалежнасці, 72.*

Анонс

## ШЧЫРАЕ СЛУЖЭННЕ ЛІТАРАТУРЫ

*Размова на такую тэму пройдзе заўтра, 6 жніўня, у Пінскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы на круглым стале «Узняцца да лёсу чалавечага» ў знак 75-годдзя з дня нараджэння вядомага беларускага літаратурнага крытыка і літаратуразнаўцы Валянціны ЛОКУН.*

*Чалавек нязпростага лёсу, творца, якая большую частку свайго жыцця правяла ў сценах уласнай кватэры, паспела за адведзеныя ёй дзесяцігоддзі зрабіць вельмі шмат. Абараніла дысертацыю на званне кандыдата філалагічных навук. Напісала доктарскую дысертацыю, але з-за шэрага абставін не змагла яе абараніць. Выдала шэраг манаграфій, напісала раздзелы ў акадэмічнай «Гісторыі беларускай літаратуры», дзясяткі літаратурна-крытычных артыкулаў, творчых партрэтаў, рэцэнзій. Валянціна Локун друкавалася ў часопісах «Полымя», «Нёман», «Маладосць», «Роднае слова», газеце «Літаратура і мастацтва». Яна шчыра, захоплена пісала пра творчасць Васіля Быкава, Уладзіміра Гніламёдава, Валянціны Коўтун, Алега Ждана, іншых празаікаў, паэтаў, літаратуразнаўцаў, дзіцячых пісьменнікаў.*

*На круглым стале, арганізатарамі якога выступілі Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага, аддзел культуры Пінскага гарвыканкама, Пінская цэнтральная гарадская бібліятэка, выступяць пісьменнікі, краязнаўцы, бібліятэкары з Пінска, Гродна, Брэста, Мінска.*

**Сяргей ШЫЧКО.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.30 | 21.00 | 15.30 |
| Віцебск — | 5.15 | 20.54 | 15.39 |
| Магілёў — | 5.20 | 20.50 | 15.30 |
| Гомель — | 5.23 | 20.40 | 15.17 |
| Гродна — | 5.47 | 21.14 | 15.27 |
| Брэст — | 5.53 | 21.09 | 15.16 |

## Месяц

*Апошняя квадра 31 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

*Пр. Марыі, Трафіма.*
*К. Караліны, Марыі, Освальда, Станіслава.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Доктар, у мяне грып, што вы мне параіце?

— Трымайцеся ад мяне падалей!

**У невялікім гарадку памірае мясцовы багацей. Усю сваю велізарную маёмасць ён адпісвае двум сынам. Але талковаму і працавітаму пакідае адну толькі карчму, а бесталковаму і вечна п'янаму — усё астатняе. Стары сябар, які прыйшоў праведаць хворага, спрабуе наставіць яго на шлях мудрасці:**

**— Гэта, вядома, не мая справа... Гэта твае грошы і твае сыны... Але ж гэты прап'е ўсё тваё багацце за паўгода!**

**— Правільна. Але дзе ён яго прап'е, калі ў горадзе ўсяго адна карчма?**



Даты | Падзеі | Людзі

### 5 ЖНІЎНЯ




**1461** год — нарадзіўся Аляксандр Ягелон (Ягелончык), вялікі князь літоўскі, кароль польскі.

**1506** год — адбылася Клецкая бітва. Яна стала самым значным паражэннем крымскіх татараў у Беларусі і паклала канец іх буйным набегам за Прыпяць. У 1996-м на месцы бітвы пастаўлены помнік.

**1896** год — нарадзіўся Леанід Аляксеевіч Маркевіч, беларускі кампазітар і дырыжор, заслужаны артыст БССР. У 1921—1928 гадах — дырыжор БДТ-1, у 1929—1965 гадах — загадчык музычнай часткі, дырыжор Беларускага тэатра імя Я. Коласа.

**1931** год — нарадзіўся Павел Кузьміч Дзюбайла, беларускі крытык і літаратуразнаўца, доктар філалагічных навук, прафесар. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа.

**1976** год — нарадзіўся Віталь Вячаслававіч Дзербянёў, беларускі спартсмен (цяжкая атлетыка), майстар спорту Беларусі міжнароднага класа, заслужаны майстар спорту Беларусі. Сярэбраны прызёр чэмпіянату свету сярод юніёраў у суме дваябор'я і бронзавы прызёр у рыўку. 7-е месца на XXVII Алімпійскіх гульнях. Чэмпіён Еўропы.






**1811** год — нарадзіўся Шарль Луі Амбруаз Тама, французскі кампазітар, адзін са стваральнікаў жанру лірычнай оперы.

**1906** год — нарадзіўся Васіль Васілевіч Лявонцьеў, вучоны-эканаміст, стваральнік тэорыі міжгаліновага аналізу эканамічных сістэм, заснавальнік Міжнароднага цэнтра сацыяльна-эканамічных даследаванняў «Лявонцьеўскі цэнтр», лаўрэат Нобелеўскай прэміі па эканоміцы.

У гэты ж дзень нарадзіўся Джон Х'юстан, амерыканскі кінарэжысёр, сцэнарыст, акцёр. Сярод фільмаў: «Мальтыйскі сокал», «Мулен Руж», «Непрыкаяныя» і іншыя.

**1941** год — нарадзіўся Леанід Дзянісавіч Кізім, лётчык-касманаўт СССР, двойчы Герой Савецкага Саюза.




**Джон ПАЙЛОТ:**

*«Тое, што ідзе ад сэрца, да сэрца і даходзіць».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2166.

Нумар падпісаны ў 19.30 4 жніўня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12